**УДК 39.01(=161.3)+39.01(=172)](091)**

# ВЫНАХОДНІЦТВА ЭТНАГРАФІЧНЫХ РЭГІЁНАЎ БЕЛАРУСІ І ЛІТВЫ: ПАРАЎНАЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

***канд. гіст. навук Ю.І. ВНУКОВІЧ***
***(Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск)***

*Параўноўваецца вынаходніцтва этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі і Літвы як інструментаў навуковай класіфікацыі і інтэрпрэтацыі тэрытарыяльных варыянтаў этнічнай культуры. Паказана выключная важнасць сацыяльна рэлевантных маркераў тэрытарыяльнай ідэнтычнасці/адрознасці для паспяховага канструявання этнаграфічнага рэгіёна як у навуковым, так і ў шырокім публічным дыскурсах. На прыкладзе гістарычнай Віленшчыны прадэманстравана, якім чынам у выніку дзяржаўна-тэрытарыяльных змен адбываецца інтэграцыя ў нацыянальныя праекты этнаграфічных рэгіёнаў этнічна неаднастайных памежных тэрыторый.*

***Ключавыя словы:*** *этнічная культура, навуковая класіфікацыя, этнаграфічны рэгіён, катэгарызацыя, ідэнтыфікацыя, Беларусь, Літва, кампаратывістыка.*

**Уводзіны.** Даследуючы культуры народаў свету, этнолагі рэгулярна сутыкаюцца з неабходнасцю вылучэння іх спецыфічных варыянтных тыпаў. У аснове адной з найбольш ранніх і распаўсюджаных класіфікацый разнастайнасці этнічных культур ляжыць крытэрый іх тэрытарыяльнай прыналежнасці. У айчыннай этналогіі гэтая навуковая традыцыя знайшла сваё найбольш выразнае адлюстраванне ў распрацоўцы так званага «гісторыка-этнаграфічнага раяніравання», выкананага на падставе падсістэм матэрыяльнай культуры беларускім этнографам В.С. Цітовым [1–3]. Праўда, навуковы канструкт «гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна»[1], прыняты і шырока растыражаваны ў працах айчынных даследчыкаў канца ХХ – пачатку ХХІ ст., так і не набыў магутнага інструментальнага значэння, якое ён мае ў многіх краінах Еўропы. Каб лепш зразумець прычыны такой сітуацыі, нялішнім будзе звярнуцца да замежнага вопыту вынаходніцтва і канцэптуалізацыі этнаграфічных рэгіёнаў. Адзін з найбольш блізкіх і даволі паспяховых прыкладаў канструявання этнатэрытарыяльных ідэнтычнасцей дэманструе суседняя Літва, дзе вывучэнне лакальна-рэгіянальнай разнастайнасці этнічнай культуры было і ёсць адным з прыярытэтных кірункаў этналагічнай навукі [4, p. 21–24; 5, p. 126; 6, p. 126–127; 7, p. 12–18].

Хоць само паняцце этнаграфічнага рэгіёна[2] з'яўляецца даволі ўмоўным і адносным, яно мае вялікае інструментальнае значэнне і аказвае непасрэдны ўплыў на характар інтэрпрэтацый варыянтных з'яў этнічнай культуры як у навуковым, так і ў куды больш шырокім публічным дыскурсе (непасрэдна звязаным з узнаўленнем і падтрыманнем рэгіянальнай ідэнтычнасці). Літоўскі этнолаг В. Туменас увогуле задаецца пытаннем: «Калі існуе шмат разнастайных варыянтаў падзелу Літвы на пяць этнаграфічных зямель, ніводны з якіх не фармалізаваны на адміністрацыйнай карце краіны (у адрозненне ад суседняй Латвіі), а ў першай палове XIX ст. такой разнастайнасці рэгіёнаў яшчэ ўвогуле не было, ёсць усе падставы ўзняць пытанне, ці не з'яўляецца паняцце субэтнасаў і іх зямель легендай альбо выключна інструментам класіфікацыі, створаным у галовах вучоных, сучасным міфам культурнай ідэнтычнасці. Ці папулярнае разуменне субэтнічнага, субрэгінальнага патрыятызму, якое існуе ў грамадстве, мае што-небудзь агульнае з навуковымі высновамі?» [5, p. 127].

Мэта гэтага артыкула – параўнаць канцэптуальныя падыходы ў навуковым канструяванні этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі і Літвы, улічыўшы перадусім іх інструментальную значнасць у дыскурсіўным працэсе фарміравання рэгіянальнай ідэнтычнасці. Канструктывісцкі кірунак у сучасных гуманітарных навуках заахвочвае нас разгледзець гэтую праблематыку ў паняццях, якія падкрэсліваюць суб'ектыўны, множны, сітуацыйны характар (этнічнай, рэгіянальнай і інш.) ідэнтычнасці[3], што канструюецца і рэканструюецца ў працэсе дыскурсу. Пры гэтым асноўная ўвага будзе звернута не на *культурны інвентар* (г. зн.

---

[1] У навуковай літаратуры сустракаецца шэраг фактычна сінанімічных паняццяў: «гісторыка-культурны рэгіён», «этнаграфічная вобласць», «этнакультурны рэгіён», «этнарэгіён» і інш. У літоўскай этналогіі таксама прыняты тэрмін «этнаграфічная зямля» (літ. *etnografinė žemė*), які ў большай ступені выяўляе семантыку зямляцтва/сваяцтва, а таксама мае пэўныя канатацыі з гістарычнымі назвамі кшталту *Жамойцкая зямля*.

[2] У артыкуле ўжываецца тэрмін «этнаграфічны рэгіён» у яго самым шырокім значэнні, сугучна ідэям П. Бурдзьё, што любы рэгіён найперш трэба разглядаць як прадукт акта класіфікацыі [8, с. 48–49]. Згодна з гэтай логікай этнаграфічны рэгіён пачынаецца тады, калі ён пачынае цікавіць этнографаў, г. зн. можна казаць пра яго фармальнае вынаходніцтва (у тым сэнсе, як разумеў гэты працэс Э. Хабсбаўм [9, p. 4–7]).

[3] На хрэстаматыйным прыкладзе братоў Іваноўскіх гэта выдатна праілюстраваў беларускі этнолаг П.У. Церашковіч, які акцэнтаваў асабліва высокую ступень культурнай гібрыдызацыі, эластычнасці і зменлівасці ідэнтычнасці ў сацыяльных практыках жыхароў памежжа [10, с. 266–268].

знешнія «аб'ектыўныя» адрозненні), якія змяшчаюць у сабе этнаграфічныя рэгіёны, а на сацыяльна рэлевантныя маркеры ідэнтычнасці, г. зн. дыферэнцыяльныя прыкметы, якія людзі знаходзяць у іншых і выяўляюць самі для дэманстрацыі сваёй тэрытарыяльнай прыналежнасці.

**Асноўная частка.** Першапраходцам, які свядома падзяліў Літву на асобныя гістарычныя рэгіёны, быў вядомы археолаг, гісторык і этнограф Т. Нарбут. Сам ураджэнец беларуска-літоўскага памежжа, ён сістэматычна вывучаў гісторыю ВКЛ, праводзіў археаграфічныя і археалагічныя росшукі на Лідчыне. У сваім артыкуле «Вызначэнне межаў уласнай Літвы ад стараны Славяншчыны» («Oznaczenie granic Litwy właściwej od strony Słowiańszczyzny»)[4], ён не толькі геаграфічна адасобіў «сапраўдную Літву» ад славян (г. зн. ад суседняй Польшчы і Беларусі), але яшчэ і вылучыў у ёй чатыры «правінцыі» [11, s. 269–270]. Паводле Т. Нарбута, у міжрэччы Пелясы, Дзітвы, Жыжмы і Шальчы размяшчалася *Пелюзія* (або *Пелязія*); далей у бок Віліі аж да ракі Нявежы – правінцыя *Нерома*; тэрыторыю ад ракі Нявежы на ўсход, ахопліваючы ўвесь Вількамірскі павет, займала Верхняя (Горная) Літва (*Auxtele*)[5]; аж да мора распасціралася Ніжняя (Дольная) Літва – Жамойцкая зямля (або *Жмудзь*)[6]. Вылучэнне «Неромы» і «Пелюзіі» («Пелязіі») у якасці асобных гістарычных абласцей Літвы не мела пад сабой асаблівага навуковага грунту (за выключэннем нешматлікіх згадак зямлі Неромы ў сярэдневяковых летапісах, якую Т. Нарбут штучна намагаўся «прывязаць» да літоўскай назвы ракі Віліі – *Нярыс*). Аднак відавочна, што акрэсленыя такім чынам «правінцыі» адлюстроўвалі найперш уласнае разуменне даследчыкам тэрытарыяльна-гістарычных асаблівасцей Літвы. Напрыклад, на першы погляд загадкавую Пелюзію[7] ва ўяўленні Т. Нарбута засялялі групы мясцовага літоўскага насельніцтва, важную ролю ў фарміраванні якіх адыгралі заходнія балты (борці, дайновы і інш.), што ў мінулым сяліліся ў раёне ракі і аднайменнага возера Пеляса. Пры гэтым ён адзначаў, што дыялектныя адрозненні паміж літоўцамі Аўкштайціі ды прыдуманых ім Пелюзіі і Неромы значна меншыя ў параўнанні з літоўцамі Жэмайціі, а найчысцейшая літоўская мова захавалася ў Вількамірскім павеце, г. зн. «на класічных літоўскіх землях» [11, s. 269–270].

Іншы вядомы гісторык, сучаснік Т. Нарбута, М. Балінскі сцвярджаў, што ў першай палове XIX ст. у народным ужытку ўсё яшчэ захоўваліся назвы зямель былога ВКЛ, якія вынікалі «з розніцы родавай яго жыхароў, або іх мясцовага становішча і звычаяў» [12, s. 117]. Паводле М. Балінскага, усё Віленскае і большая частка Трокскага ваяводства ёсць *уласная Літва*, а Жамойцкае княства з'яўляецца «ніжэйшай яе [Літвы?] часткай», або *Жмуддзю*; ваяводствы Полацкае, Віцебскае і Мсціслаўскае з [усходняй] часткай Мінскага называюцца *Беларуссю*, Навагрудскае з часткамі Трокскага каля Гродна і [заходняй] Мінскага – *Чорнай Руссю*; астатняя частка Трокскага ваяводства паміж Нёманам, Аўгустоўскай пушчай і прускай мяжой завецца *Запушчанскім Трактам*; нарэшце, паўднёвыя часткі ваяводстваў Мінскага і Брэст-Літоўскага – *Палессем* [12, s. 117]. Такі гістарычны падзел Літвы і Беларусі з невялікімі варыяцыямі заставаўся пануючым у працах многіх польскамоўных даследчыкаў XIX ст.[8]

Адным з першых, хто паспрабаваў класіфікаваць беларусаў на асобныя «нацыянальныя групы» быў афіцэр расійскай арміі, этнограф і картограф нямецкага паходжання Р.Ф. Эркерт. У сваёй працы «Погляд на гісторыю і этнаграфію заходніх губерняў Расіі» («Взгляд на историю и этнографию западных губерний России») [14], якая выйшла ў якасці спецыяльнага дадатку да яго «Этнаграфічнага атласа заходне-рускіх губерняў і суседніх абласцей» («Этнографический атлас западно-русских губерний и соседних областей») [15], наконт этнатэрытарыяльнай адрознасці беларусаў ён даслоўна пісаў наступнае: «Первоначальные национальныя особенности, свойство почвы, соседство Литовцев и влияние Поляков создали несколько национальных групп Белоруссов, которыя существуют еще и теперь, или именно теперь-то более или менее ясно. Особенно заметны две главныя группы. Первую из них составляют так называемые *настоящие Белоруссы* в губерниях Витебской и Могилевской (также далее на восток) и в восточной части Минской губернии. Они примыкают на западе к Латышам, к Двине вверх до Десны и далее к Борисову, вниз по Березине. Другую группу составляют живущие далее на западе *Белоруссы, которые однако сами не зовут себя этим именем, да и Поляками не называются Белоруссами*; они по большей части не дают себе никакого национального названия, а язык свой называют «простым». Великоруссы и Поляки в общежитии обыкновенно обозначают их словами: «из униатов». Для этих западных Белоруссов, которые сильно подверглись польскому влиянию,

---

[4] Калі падыход вызначаць межы старажытнай (лічы, уяўнай) «сапраўднай Літвы», закладзены Т. Нарбутам, фактычна лёг у падмурак дыскурсу тэрытарыялізацыі літоўскай этнічнасці ў яе гістарычнай праекцыі, то вылучаныя ім «правінцыі» Літвы засталіся ў літоўскай гістарыяграфіі парадаксальным чынам ніяк не праінтэрпрэтаваныя і не асветленыя.

[5] Відаць, тут пададзены перакручаны лацінізаваны варыянт назвы Аўкштайціі (літ. *Aukštaitija*), якая ў сваю чаргу этымалагічна звязваецца з літ. *aukštas* «высокі».

[6] Цяпер прынятая назва Жэмайція (літ. *Žemaitija*); паходзіць ад літоўскага слова *žemas* «нізкі».

[7] Тут нялішнім будзе прыгадаць, што менавіта ў гэтай «правінцыі» (у Лідскім павеце) размяшчаўся родавы маёнтак Нарбутаў – Шаўры, у ваколіцах якога даследчык правёў большую частку сваіх натурных і археалагічных даследаванняў.

[8] У канцы XIX ст. польскі антраполаг Ю. Талька-Грынцэвіч «на падставе мовы, паходжання і культуры» не толькі вылучыў тры групы беларусаў («усходніх», «заходніх» і «палешукоў»), але і паспрабаваў вызначыць прыблізную іх колькасць [13, s. 6–8].

в особенности в северо-восточной трети Гродненской губернии, принято вообще название Черноруссов (по черным овцам, из шерсти которых они делают себе одежду); но сами они не называют себя этим именем[9]. Большая часть Подлясья, в особенности Сокольский уезд, и весьма немногия места Августовской губернии в Царстве Польском, населены третьей, наиболее ополяченной категорией Белоруссов (Подляшанами)» [14, с. 64]. Як добра бачна (звярніце ўвагу на арыгінальны аўтарскі курсіў!), галоўным крытэрыем свайго падзелу беларусаў на тры этнаграфічныя групы[10] Р.Ф. Эркерт паспрабаваў зрабіць катэгарызацыю і ідэнтыфікацыю як самімі людзьмі, што непасрэдна ўваходзілі ў гэтыя групы (г. зн. уласна беларусамі), так і тымі, хто ў гэтыя групы не ўваходзіў, але жыў тут па-суседству («в общежитии») (г. зн. рускімі і палякамі)[11]. Пры гэтым асноўным маркерам іх ідэнтычнасці/адрознасці выступала канфесійная прыналежнасць як асноўная ўліковая адзінка Расійскай імперыі таго часу. Нельга не заўважыць, што ў цэлым класіфікацыя беларусаў на заходнюю і ўсходнюю групы, прапанаваная Р.Ф. Эркертам, адпавядала гістарычна-геаграфічнаму падзелу тэрыторыі іх пражывання на Літву і [Белую] Русь, большасць аб'ектыўных крытэрыяў размежавання якіх да XIX ст. ужо размыліся [17, с. 159].

Кожную з гэтых груп беларусаў Р.Ф. Эркерт у духу свайго часу надзяліў прымардыяльнымі этнаграфічнымі ўласцівасцямі: «Настоящие Белоруссы находятся на очень низкой степени образования; жители Могилевской губернии очень бедны, малаго роста и слабаго сложения; их язык, одежда и нравы подверглись польскому влиянию меньше, нежели в большей части уездов Витебской губернии, которая, по своему географическому положению, была долго театром войн между Поляками и враждебными им соседами на севере» [14, с. 65]. «Собственную Белоруссию» (узгадаем Нарбутаўскую «ўласную Літву»!)[12], дзе «обработка земли в высшей степени запущена», даследчык метафарычна параўноўваў «с бедной, но прекрасной девушкой, которая может разсчитывать на богатое наследство» [14, с. 65]. А вось заходнія, ці «каталіцкія» беларусы ўсяляк прыраўноўваліся ім да палякаў і супрацьпастаўляліся «велікарусам»: «Католические Белоруссы вообще (которых мы более или менее считаем Поляками) почти все носят польский костюм, отличающийся от одежды Белоруссов; по своему образу мыслей, привычкам и роду жизни, они совершенные Поляки». І далей: «В нравах и роде жизни западных, не настоящих Белоруссов, сильно обнаруживается польское влияние; но у них до сих пор и не было почти никакой связи с Великоруссами. Они бреют бороду и усы, одеваются очень бедно, и имеют темный цвет лица. Общественные удовольствия их заключаются в музыке (скрипка) и пляске; для последней они собираются по праздникам в корчме (совершенно польском заведении, составляющем резкую противуположность к чисто русскому постоялому двору) и попарно, мущина с женщиной, пляшут польские танцы» [14, с. 66]. Зазначым, што падобны стэрэатып заходніх беларусаў як моцна спаланізаваных і акаталічаных захоўваўся цягам усяго XX ст.

Што тычыцца літоўцаў, то Р.Ф. Эркерт падзяліў іх усяго толькі на дзве групы, «находящиеся между собою в близком родстве, а именно на Литовцев в тесном смысле слова, или Литвинов, и Жмудь» [14, с. 69]. Больш за тое, калі беларусы на створанай ім этнаграфічнай карце «лагатыпізаваныя» адным колерам[13], то літоўцы ў адпаведнасці з гэтай класіфікацыяй выяўлены ў двух розных колерах, што адпаведна пазначаюць рассяленне «літвінаў» і «самагітаў» (ці «Жмудзі») [15, Т. І]. Характарызуючы розніцу паміж гэтымі групамі «літоўскага племені», Р.Ф. Эркерт пісаў, што «Жмудь в нравственном и материальном отношении стоит гораздо выше Литовцев», а «самый чистый тип ея можно найти в Тельшевском уезде, где в тоже время и очень любимое земледелие развито гораздо более, нежели во всех прочих уездах, населенных Жмудью» [14, с. 69]. Апісваючы Жэмайцію, даследчык параўноўваў яе са Швейцарыяй: «В топографическом отношении страну, населенную Жмудью, можно назвать чем-то в роде Швейцарии; селения и дома отличаются чистотою и довольством». Жэмайты, на ягоную думку, вылучаліся таксама «большою религиозностью, привязанностью к католической вере, твердостью и энергиею характера и воинственным духом» [14, с. 70]. Падобны стэрэатып Жэмайціі (як своеасаблівага рэзервата «літоўскасці») канструявалі многія даследчыкі XIX ст.[14] Дастаткова толькі сказаць, што менавіта ўраджэнцы гэтай часткі Літвы

[9] Пра гістарыяграфічную штучнасць тэрміна «чарнарусы» пісаў не толькі Р.Ф. Эркерт. Напрыклад, крытыкуючы знакамітую працу А. Кіркора, яго сучаснік і апанент С.В. Шалковіч адзначаў: «Между народностями Литовскаго полесья автор очерка находит и *Черноруссов*; он помещает их в 3-х приходах Лидскаго уезда. Считаем долгом заметить, что такого названия племени мы нигде не встречали в западно-русских актах; оно существует только в польской исторической литературе» [16, с. 85].

[10] Жыхароў Заходняга Палесся Р.Ф. Эркерт аднёс да «маларусаў».

[11] Тут дарэчы яшчэ будзе звярнуць увагу на тое, што ў сваіх высновах Р.Ф. Эркерт абапіраўся не толькі на асабістыя назіранні, але і на апытанні «некалькіх сотняў салдат, ураджэнцаў тых мясцовасцей» [14, с. 5].

[12] Увогуле пошук і канцэптуалізацыя «класічных», «сапраўдных», «спрадвечных» зямель таго або іншага народа была адной з цэнтральных тэм еўрапейскага народазнаўства XIX ст. З гэтым звязана актыўнае канструяванне моваведамі, этнографамі і фальклярыстамі ў сваіх працах спецыфічных моўных і культурных эталонаў этнічнага, адрозных ад аналагічных атрыбутаў сваіх найбліжэйшых суседзяў.

[13] Словы пра этнічную маргінальнасць заходніх беларусаў на карце наглядна мусіла пацвярджаць неверагодная колькасць ружовых плямін, што абазначалі анклавы польскага насельніцтва.

[14] Вядомы фальклярыст П.А. Бяссонаў нават лічыў, што ў пытаннях супраціву культурнай і моўнай асіміляцыі з боку палякаў у жэмайтаў маглі б падвучыцца і беларусы: «Литовский корень, еще целый на Жмуди, виден в ее природе, сильной, могучей, резкой типом и чертами, сильной физическим сложением, выразительной глазами, не бледной,

(Д. Пашкевіч, Л. Юцэвіч, С. Даўкантас і інш.), якія свабодна валодалі літоўскай мовай і добра ведалі культуру літоўцаў «знутры», яшчэ ў першай палове XIX ст. задалі ў сваіх класічных працах тыя культурныя эталоны «літоўскага», што пасля па інерцыі сталі выкарыстоўвацца іншымі даследчыкамі для ацэнкі адпаведнасці «традыцыйнаму» і «этнічнаму». Да таго ж, лінгвістычна-этнаграфічны каларыт Жэмайціі-*Жмудзі* (у яе самым шырокім разуменні) у літоўскай нацыянальнай праекцыі вельмі добра падыходзіў для канструявання сімвалічнай культурнай мяжы з «іншымі» суседзямі і, адпаведна, для стварэння выразнага вобразу «літоўскага» з максімальным індэксам адрознасці[15].

Такім чынам, самыя першыя спробы класіфікаваць беларусаў і літоўцаў паводле іх этнатэрытарыяльных адрозненняў былі зроблены яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Гэтыя класіфікацыі ў значнай ступені былі заснаваныя на рэгіянальных самапрэзентацыях мясцовага насельніцтва і адлюстроўвалі гістарычны падзел літоўцаў як мінімум на дзве вялікія групы – аўкштайтаў («сапраўдную Літву») і жэмайтаў («Жмудзь»), а беларусаў – на ўсходніх, пераважна праваслаўных («сапраўдных») і заходніх, канфесійна неаднастайных (з размытай катэгарызацыяй і ідэнтыфікацыяй) беларусаў; у якасці асобных этнаграфічных груп беларусаў даследчыкі таксама вылучалі падляшан і палешукоў. Адзначым, што гэтыя класіфікацыі ў далейшым былі пакладзены ў аснову не толькі этнакультурнага рэгіянавання (найперш Літвы), але таксама дыялектнага падзелу літоўскай і беларускай моў[16]. Канструяванне новых этнарэгіянальных ідэнтычнасцей адбывалася па меры назапашвання эмпірычных звестак, якія дазвалялі даследчыкам аб'ектываваць адрозненні і надзяляць тыя або іншыя тэрытарыяльныя групы насельніцтва спецыфічнымі культурнымі маркерамі, што вылучалі іх на фоне адзінак такога ж парадку. Пры гэтым важна мець на ўвазе, што ўжо ў сярэдзіне XIX ст. беларускія і літоўскія землі закранулі дынамічныя мадэрнізацыйныя працэсы, якія ўздзейнічалі не толькі на іх сацыяльныя сувязі, культуру, межы і этнанімію, але і на само разуменне рэгіяналізму. Паказальнае ў гэтым плане вынаходніцтва і канцэптуалізацыя ў канцы XIX – першай палове XX ст. такіх этнарэгіёнаў Літвы, як Дзукія, Сувалкія і Клайпедскі край[17].

Лічыцца, што ўпершыню назву *дзюкі* («Dziuki») разам з шэрагам іншых калектыўных мянушак («Gogi», «Staki», «Szaki», «Zanawiki» і «Użwingi») у дачыненні да розных лакальных груп літоўцаў, што жылі ў Занямонні, зафіксаваў у сярэдзіне XIX ст. знакаміты даследчык ляснай гаспадаркі А. Палуянскі [20, s. 132–133]. Паводле яго, літоўцы-дзукі займалі ўвесь Кальварыйскі і паўночную частку Сейненскага паветаў Аўгустоўскай губерні. У апошняй чвэрці XIX ст. гэтую, першапачаткова вузкалакальную назву («Дзюкі») і лінгвістычную дыялектную асаблівасць *дзекання/дзукання* (літ. *dzūkavimas*), характэрную для літоўскіх гаворак Кальварыйскага, Сейненскага, Гродзенскага і Трокскага паветаў, пасля працяглага экспедыцыйнага вывучэння гэтага краю суаднёс і фактычна звязаў разам вядомы мовазнаўца і этнограф Э. Вольтэр [21, с. 2–5]. Пры гэтым саму фанетычную з'яву *дзекання* ён лічыў вынікам заходнебалцкага («прускага») уплыву ў гэтым рэгіёне Літвы, які ў мінулым насялялі старажытныя судовы і дайновы. Апрача іншага, Э. Вольтэр засведчыў факт знешняй катэгарызацыі *дзукаў* як «мяшанцаў» іх паўночнымі суседзямі *жэмайтамі* («Любопытно еще и то, что некоторыя выражения этих Дзюков, на которых, как на мешанцев, Жмудины смотрят иногда с презрением, – более оригинальныя чем у остальных Литовцев») [21, с. 5]. Прыблізна ў гэты самы час найменне *дзукі* (літ. *dzūkai*) у якасці самаабазначэння стала ўжывацца ў папулярным літоўскім друку і самімі ўраджэнцамі гэтага краю. Адзін з першых такіх артыкулаў – «З Дзукіі» («Isz Dzukijos») – быў падпісаны псеўданімам «Дзукас» («Dzukas») і надрукаваны ў газеце «Варпас» («Varpas») у 1889 г. [22, p. 157]. У ім *дзукі* былі паказаныя не толькі як літоўцы, на якіх найбольшы ўплыў аказалі славянскія суседзі, што ў выніку адбілася на іх лагодным характары («Па прычыне суседства з павольнымі Русінамі [г. зн. беларусамі. – *Ю.В.*] і збяднелымі Мазурамі, характар Дзука стаў мякчэйшым, лаўчэйшым і міралюбівым да чужынцаў, але і схільным да асіміляцыі»), а таксама закладаўся стэрэатып Дзукіі як рэгіёна Літвы, дзе «часцей можна бачыць старажытныя звычаі патрыярхальныя»[18] [22, p. 157].

---

не исхудалой, не золотушной до остова, <...> виден в языке ее, доселе могучем и крепком, и древнем, и неуступчивом, несмотря на узкое сокращение этнографических границ… [Сравните с этим] бестипичность, бледность, белокурость, безголосность, бесхозяйственность, языковую уступчивость крестьянина белоруса» [18, с. 508–509].

[15] Падобную ролю ў стварэнні фальклорна-этнаграфічнага канона «беларускага» адыгралі ўсходнія рэгіёны Беларусі (Палессе, Падзвінне і Падняпроўе), якія ў другой палове XIX – пачатку XX ст. былі грунтоўна апісаныя цэлай плеядай выбітных этнографаў, фалькларыстаў і мовазнаўцаў.

[16] Па сутнасці, сённяшнюю схему тэрытарыяльнага падзелу беларускай мовы на два асноўныя дыялекты заклаў яшчэ Я. Чачот, які сабраў і параўнаў узоры мовы і фальклору сялян «з-над Нёмана» і «з-над Дзвіны» [19, s. X–XVIII, XXX].

[17] Што тычыцца Аўкштайціі і Жэмайціі як самых вялікіх гістарычных рэгіёнаў Літвы, то галоўная навуковая праблема заключалася ў вызначэнні дакладнай мяжы паміж імі, якую вельмі адрозна бачылі гісторыкі, этнолагі, лінгвісты, этнамузыколагі і інш. Таму ў літоўскай гістарыяграфіі прынята адрозніваць «гістарычную», «этнаграфічную» і «лінгвістычную» Аўкштайцію і Жэмайцію.

[18] У гэтым сэнсе літоўская Дзукія вельмі падобная да беларускага Палесся, якое, як трапна заўважыў П.У. Церашковіч, «было і застаецца нечым кшталту Трабрыянскіх выспаў або ўзбярэжжа Новай Гвінеі для шматлікіх даследчыкаў традыцыйнай культуры Усходняй Еўропы» [10, с. 259].

У міжваенны час канцэптуалізацыяй Дзукіі (або *Дайнавы*) як самабытнага краю Літвы ў сваёй творчасці актыўна займаліся яе ўраджэнцы, знакамітыя літоўскія літаратары і публіцысты В. Крэве-Міцкявічус і Б. Сруога, якія, апрача ўсяго іншага, засведчылі ўнікальнасць і багацце фальклорнай спадчыны дзукаў. Як сцвярджае літоўскі этнолаг П. Кальнюс, галоўным фактарам, што паскорыў вылучэнне і прызнанне этнаграфічнай вобласці Дзукіі, раўназначнай паводле свайго рангу Аўкштайціі, Жэмайціі, Сувалкіі і Малой Літве, было ўсведамленне пачуцця агульнасці і дэкларацыя адметнасці самімі дзукамі [23, p. 99]. Так ці інакш, выразны лінгвістычны маркер дзукскай рэгіянальнай ідэнтычнасці ў перспектыве дазволіў навукоўцам не толькі вылучыць паўднёвы (дзукскі) дыялект літоўскай мовы[19], але і канцэптуалізаваць асобны этнаграфічны рэгіён Літвы – Дзукію (літ. *Dzūkija*)[20], межы якога залежалі ад канкрэтнага крытэрыю, пакладзенага ў аснову той або іншай навуковай класіфікацыі (спецыфіка мовы, матэрыяльнай ці духоўнай культуры). Дзукскасць як пэўная з'ява рэгіянальнай культуры і Дзукія як асобны этнаграфічны рэгіён Літвы, у якім пражываюць не толькі літоўцы, усё больш інтэнсіўна брэндзіруецца і экспануецца ў канцы XX – пачатку XXI ст. Хоць на стагоддзе раней яна ўсё яшчэ ўспрымалася складовай часткай (субрэгіёнам) іншага этнаграфічнага рэгіёна Літвы – Сувалкіі (літ. *Suvalkija*), вынаходніцтва і ўяўленне якой адбывалася крыху інакш.

Назва гэтага рэгіёна[21], сучасныя контуры якога вызначаюць рака Нёман і мяжа Літвы з Польшчай, паходзіць ад адміністрацыйнага цэнтра, што цяпер знаходзіцца па-за межамі літоўскай дзяржавы – польскага горада Сувалкаў. З 1795 да 1807 г. гэтая частка Літвы належала Прусіі, у 1807 – 1815 гг. – Герцагству Польскаму (якое знаходзілася пад пратэктаратам напалеонаўскай Францыі), у 1815 – 1917 гг. – Царству Польскаму (аўтаномнай дзяржаве ў складзе Расійскай імперыі). З 1867 г. з часткі Аўгустоўскай губерні была ўтворана Сувалкская губерня, у якую ўвайшло і літоўскае Занямонне. З гэтага часу тэрыторыю губерні паводле адміністрацыйнага прынцыпу пачынаюць называць Сувальшчынай (па-літоўску – Сувал[ь]кія). Узнікненне спецыфічных рыс у культуры мясцовага літоўскага насельніцтва прынята звязваць з працэсамі мадэрнізацыі, якія закранулі гэты рэгіён значна раней за ўсе астатнія літоўскія землі, што ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. Напрыклад, тут на некалькі дзесяцігоддзяў раней было скасавана прыгоннае права, больш за сто гадоў (з 1808 г.) дзейнічаў грамадзянскі кодэкс Напалеона, ніколі не скасоўваўся і ўвесь час дзейнічаў Грыгарыянскі каляндар і г.д. Больш сучасныя формы гаспадарання, актыўнае перайманне заходніх стандартаў побыту, параўнальна высокая ступень заможнасці мясцовых сялян прывялі да фарміравання ў асяроддзі іншых груп літоўцаў стэрэатыпу сувалькійцаў[22] як вельмі дбайных, але ашчадных і нават сквапных гаспадароў [27, p. 112].

Трэба адзначыць, што «адміністрацыйны» прынцып вылучэння гэтага этнаграфічнага рэгіёна Літвы прывёў да таго, што ў ім былі аб'яднаны даволі адрозныя паводле сваёй ідэнтычнасці лакальныя групы літоўцаў (якіх згадваў яшчэ А. Палуянскі). Нядзіўна, што найбуйнейшыя з іх – *занавікі*, *капсы* і *дзукі* – утварылі тры субрэгіёны Сувалкіі, што задаюць тон у сучасным дыскурсе субрэгіянальных ідэнтычнасцей Літвы. Так ці інакш, прыклад Сувалкіі добра ілюструе выключную ролю адміністрацыйнай прыналежнасці насельніцтва ў канструяванні яго тэрытарыяльнай ідэнтычнасці. Па-першае, існуючы адміністрацыйны падзел уплывае на практыкі паўсядзённага жыцця і прымушае ідэнтыфікаваць сябе пэўным чынам, разглядаць сябе як «ідэнтычных» адзін аднаму, усведамляць сваю тэрытарыяльную агульнасць, зямляцтва, незалежна ад этнічнай прыналежнасці мясцовага насельніцтва. Па-другое, як піша літоўскі этнолаг Р. Мяркене, адміністрацыйна-палітычныя тэрыторыі дзяржавы не толькі ўзмацнялі ўнутраную інтэграцыю і стабілізацыю культурнай спадчыннасці, але і блакавалі акумуляцыю найноўшага пласта культуры суседняга блізкароднаснага насельніцтва [28, с. 137–138].

Тэрытарыяльная адасобленасць садзейнічала ўкараненню рэгіянальнай спецыфікі не толькі ў літоўскім Занямонні, але таксама ў Віленскім і Клайпедскім краях, якія пэўны час былі аддзелены дзяржаўнымі межамі ад Літвы. Адметна, што яны былі асобна выяўлены на першай карце-схеме этнаграфічных рэгіёнаў Літвы, якая была падрыхтавана і выдадзена ў 1939 г. вядомым літоўскім даследчыкам народнага тэкстылю,

---

[19] Упершыню гэта зрабіў літоўскі мовазнавец А. Саліс.

[20] Вельмі падобную («лінгвістычную») логіку мела вылучэнне асобнай лакальнай этнаграфічнай групы беларусаў-*сакуноў*, якіх у пачатку XX ст. падрабязна апісаў беларускі этнограф І.А. Сербаў [24, с. 1–3]. Аднак, у адрозненне ад дзукаў, найменне *сакуны* так і засталося прывязаным выключна да жыхароў некалькіх вёсак у вярхоўях ракі Арэсы. У навуковай літаратуры экстрапаляваць гэтую назву на больш шырокі рэгіён спрабаваў даследчык народнай архітэктуры беларусаў А.І. Лакотка, які аднёс да «краіны сакуноў» чатыры сучасныя адміністрацыйныя раёны Беларусі – Асіповіцкі, Бабруйскі, Глускі і Старадарожскі [25, с. 77, 406].

[21] Апрача назвы «Сувалкія» ў дачыненні да гэтага этнаграфічнага рэгіёна нярэдка ўжываецца гістарычная назва *Судува* (літ. *Sūduva*), рэанімаваная з сярэдневяковай наменклатуры балцкіх зямель, і геаграфічны тэрмін Занямонне (літ. *Užnemunė*).

[22] Як сцвярджае літоўскі этнолаг П. Кальнюс, для саміх літоўцаў-сувалькійцаў характэрны пэўны культурна-этнаграфічны нарцысізм і рэгіёнацэнтрызм, што вынікае з іх выключнай ролі ў гісторыі развіцця літоўскага нацыянальнага руху і станаўлення літаратурнай мовы [26, p. 46].

мастацтвазнаўцам А. Тамашайцісам (малюнак 1). Праўда, у якасці трох раўназначных этнаграфічных рэгіёнаў на ёй фігуравалі толькі Жэмайція, Аўкштайція і Сувалкія. Апошняя ў сваю чаргу складалася з трох драбнейшых субрэгіёнаў, якія былі заселены этнаграфічнымі групамі літоўцаў-*занавікаў* (літ. *zanavykai*), *капсаў* (літ. *kapsai*) і занямонскіх *дзукаў* (літ. *dzūkai*) [6, p. 127]. Вылучэнне Клайпедскага і Віленскага краёў у 1920 – 30-х гг. у якасці асобных субрэгіёнаў Літвы было абумоўлена не толькі і, хутчэй за ўсё, не столькі этнакультурнай спецыфікай гэтых памежных тэрыторый, колькі іх асаблівым палітычным статусам. Верагодна, менавіта па гэтай прычыне, як заўважыў літоўскі этнолаг Ж. Шакніс, карты этнаграфічных рэгіёнаў Літвы (у адрозненне ад Латвіі, Эстоніі ці Фінляндыі) вельмі доўгі час не друкаваліся нават у абагульняючых працах па літоўскай этналогіі [6, p. 128].




**Малюнак 1. – Карта-схема этнаграфічных рэгіёнаў Літвы, складзеная А. Тамашайцісам (1939 г.)**

Клайпедскі край – гэта частка былой Малой (або Прускай) Літвы, якую яшчэ ў XIII ст. утварылі заваяваныя Тэўтонскім ордэнам заходнебалцкія землі. Назва апошняй узнікла ў XVI ст. у выніку супрацьпастаўлення гэтай гістарычнай вобласці Вялікай Літве, г. зн. ВКЛ, ад якога яна ўвесь час была аддзелена. Прынята лічыць, што прыблізна ў гэты час тут сфарміравалася асобная этнаграфічная група (ці нават субэтнас) літоўцаў – *літоўнікаў* (літ. *lietuvininkai*), якія пакрысе анямечваліся. Нягледзячы на пануючае становішча нямецкай культуры, у Малой Літве склаліся даволі спрыяльныя ўмовы і для развіцця літоўскай культуры. З 1525 г. афіцыйнай рэлігіяй тут было абвешчана лютэранства, якое прадугледжвала набажэнствы на роднай мове насельніцтва. З гэтай мэтай вялася актыўная падрыхтоўка святароў, якія авалодвалі літоўскай і прускай мовамі. Важным культурным цэнтрам краю стаў заснаваны ў 1544 г. Каралявецкі ўніверсітэт. Да XVIII ст. у Малой Літве была створана значная колькасць пачатковых школ з літоўскай мовай навучання. У цэлым развіццё літоўскай культуры ў Малой Літве ішло больш шпаркімі тэмпамі, чым у ВКЛ. Своеасаблівыя палітычныя, сацыяльна-эканамічныя, канфесіянальныя і этнакультурныя ўмовы развіцця літоўнікаў прадвызначылі з'яўленне ў іх народнай культуры выразнай рэгіянальнай спецыфікі [29, c. 264–265].

У XIX ст. Малая Літва з'яўлялася шматкультурным памежным рэгіёнам Прусіі (з 1871 г. – Германскай імперыі), які аказваў значны ўплыў на развіццё літоўскага нацыянальнага руху ў Расійскай імперыі. Дастаткова толькі згадаць, што тут быў наладжаны друк літоўскай літаратуры, якая масава дастаўляўся кніганошамі ў Літву. У побытавых адносінах мясцовыя літоўнікі, якіх з другой паловы XIX ст. літоўская інтэлігенцыя пачала называць *мalaлітоўцамі* (літ. *mažlietuviai*), мала чым адрозніваліся ад нямецкага насельніцтва Усходняй Прусіі. Пры гэтым галоўным маркерам іх адрознасці ад уласна літоўцаў (якія ў асноўнай сваёй масе былі каталікамі) было лютэранскае веравызнанне. Гэта знайшло сваё адлюстраванне ва ўзаемных стэрэатыпах, што паўставалі на старонках літоўскага перыядычнага друку ў канцы XIX – пачатку XX ст.: у [Вялікай] Літве тыражаваўся вобраз літоўнікаў як зацятых прускіх (нямецкіх) евангелістаў-лютэран, а ў Малой Літве ўяўлялі сваіх супляменнікаў як дашчэнту спаланізаваных каталікоў [30, p. 296; 31, p. 118–119].

Хоць у 1923 – 1939 гг. Клайпедскі край на аўтаномных правах і належаў Літоўскай Рэспубліцы, яго палітычнае, эканамічнае і культурнае жыццё вызначала барацьба інтарэсаў літоўскай і нямецкай дзяржаў за ўплыў у гэтым рэгіёне [31, p. 121]. Нядзіўна, што частка мясцовых жыхароў была схільная самавызначацца не як «літоўцы» або «немцы», а як *мемельляндэрай* (літ. *memellenderiai*), г. зн. карэнныя жыхары Клайпедскага (Мемельскага) краю. У сучасным літоўскім нацыянальным дыскурсе Клайпедскі край выступае сімвалічным спадчыннікам Малой Літвы, асноўныя землі якой пасля Другой сусветнай вайны ўвайшлі ў склад Калінінградскай вобласці РСФСР. Пры гэтым татальная іміграцыя і рэпатрыяцыя аўтахтоннага (у тым ліку, анямечанага літоўскага) насельніцтва з гэтых тэрыторый у пасляваенныя гады абумовіла канструяванне клайпедскай рэгіянальнай ідэнтычнасці выключна на падставе гістарычнай памяці і спадчыны, пакінутай літоўнікамі (якіх у канцы XX ст. тут налічвалася ўсяго некалькі сотняў чалавек), аднак змадэляванай у агульналітоўскіх нацыянальных сімвалах і праекцыях. Так ці інакш, цяжка не пагадзіцца з высновай Ж. Шакніса, што без масавага імкнення мясцовай інтэлігенцыі ў канцы XX ст. «з кніг» аднаўляць культуру, якая перадавалася з пакалення ў пакаленне, гэтага рэгіёну папросту б не існавала [6, p. 138].

Канчатковая навуковая легітымізацыя Дзукіі, Сувалкіі і Клайпедскага краю як раўназначных этнаграфічных рэгіёнаў Літвы, поруч з Аўкштайціяй і Жэмайціяй, адбылася ў 1980-х гг., калі літоўскія, латышскія і эстонскія этнографы пад эгідай Інстытута этнаграфіі ім. М.М. Міклухі-Маклая АН СССР прынялі ўдзел у шырокамаштабным праекце этнаграфічнага раяніравання сваіх рэспублік. Яшчэ ў 1980 г. быў надрукаваны сумесны артыкул С. Цымерманіса і В. Маркунаса, у якім была прапанавана і абгрунтавана схема «гісторыка-этнаграфічнага раяніравання Латвіі і Літвы другой паловы XIX ст.» [32, с. 10]. У 1985 г. з'явілася афіцыйная навуковая карта гісторыка-культурных абласцей Літвы, якая была надрукавана ў першым томе абагульняючага гісторыка-этнаграфічнага атласа Прыбалтыкі, прысвечаным земляробству [33, Карта II]. На ёй былі вылучаны чатыры этнаграфічныя рэгіёны (Жэмайція, Аўкштайція, Сувалкія (Судува) і Дзукія) з даволі шырокімі пераходнымі зонамі (малюнак 2).




**Малюнак 2. – Гісторыка-культурныя рэгіёны Літвы (1985 г.)**

У наступным томе гісторыка-этнаграфічнага атласа Прыбалтыкі, прысвечаным народнаму адзенню, была ўкладзена амаль ідэнтычная «ўводная» карта, распрацаваная на падставе аналізу рэгіянальных варыянтаў традыцыйнага мужчынскага (!) адзення [34, Карта III]. І толькі на карце, зробленай на падставе тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі комплексаў народнага жаночага адзення [34, Карта 1], яркімі колерамі былі вылучаны ўсе пяць этнаграфічных рэгіёнаў Літвы (у тым ліку, Клайпедскі край) з выразна акрэсленымі межамі (малюнак 3).

Спробы больш дакладна вызначыць межы этнаграфічных рэгіёнаў Літвы актывізаваліся ў пачатку XXI ст., калі ў літоўскім грамадстве актыўна абмяркоўвалася магчымасць адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы краіны ў адпаведнасці з навуковымі ўяўленнямі аб падзеле літоўцаў на асобныя субэтнічныя групы[23]. З гэтай мэтай літоўскімі этнолагамі Ж. Шакнісам і Д. Піварунасам была падрыхтавана новая карта

[23] У межах гэтай праблематыкі было таксама ўзнята пытанне цэнтраў этнаграфічных рэгіёнаў – іх сімвалічных «сталіц».

этнаграфічных рэгіёнаў Літвы, выразныя абрысы якіх былі дакладна праведзены па межах найдрабнейшых сучасных адміністрацыйных адзінак краіны – староставў (малюнак 4). З цягам часу гэтыя карты пачалі ўспрымацца і ацэньвацца на практычным узроўні як свайго роду эмблемы, якія мелі вялікі сімвалічны эфект у справе афіцыйнага прызнання і прасторавага ўяўлення рэгіянальных ідэнтычнасцей Літвы.




**Малюнак 3. – Гісторыка-культурныя рэгіёны Літвы, вылучаныя на падставе аналізу комплексаў традыцыйнага жаночага адзення (1986 г.)**




**Малюнак 4. – Этнаграфічныя рэгіёны Літвы (паводле Ж. Шакніса і Д. Піварунаса, 2001 г.)**

Такім чынам, навуковыя практыкі этнатэрытарыяльнай класіфікацыі літоўцаў на працягу XX ст. пастаянна ўдасканальваліся і карэктаваліся з улікам гістарычных змен і дзяржаўна-тэрытарыяльных трансфармацый. Пры гэтым у іх канцэптуальнай аснове ляжалі не толькі так званыя «аб'ектыўныя» крытэрыі рэгіянальнай прыналежнасці (асаблівасці мовы, культуры, паходжання і інш.), але і так званыя «суб'ектыўныя» якасці (пачуццё прыналежнасці, калектыўная памяць, этнічныя стэрэатыпы і інш.), г. зн. рэпрэзентацыі, праз якія класіфікаваныя такім чынам людзі самі ўяўляюць гэты падзел і якія, у рэшце рэшт, садзейнічаюць рэчаіснасці такога падзелу.

Калі ў апошняй чвэрці XX – пачатку XXI ст. у Літве адбылося канчатковае зацвярджэнне пяці асноўных этнаграфічных рэгіёнаў (у тым ліку, як турыстычных брэндаў краіны), то ў Беларусі толькі адбывалася іх канцэптуальнае вынаходніцтва і навуковае канструяванне. Афіцыйным штуршком да распрацоўкі класіфікацыі тэрытарыяльных варыянтаў этнічнай культуры беларусаў, а таксама пачаткам іх фармальнай інстытуалізацыі стала рашэнне аб стварэнні ў 1976 г. Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту пад адкрытым небам, у аснову экспазіцыйнай структуры якога (па аналогіі з адпаведнымі музеямі Латвіі, Літвы і Украіны) павінны былі быць пакладзены навукова абгрунтаваныя этнаграфічныя рэгіёны [1, с. 3–5]. У хуткім часе беларускім этнографам В.С. Цітовым была прадстаўлена навуковая канцэпцыя гісторыка-этнаграфічнага раяніравання Беларусі, выкананага на падставе «аналізу разнастайных кампанентаў (ландшафтна-геаграфічных умоў, характару рассялення і арганізацыі жылога асяроддзя, гаспадарчых заняткаў, транспартных сродкаў, народнага адзення і інш.)» і ўзгодненая на самым высокім узроўні тагачаснага кіраўніцтва краіны [35, с. 5, 10]. Яна прадугледжвала вылучэнне шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў[24] – Паўночнага (Паазер'я), Усходняга (Падняпроўя), Цэнтральнага, Паўночна-Заходняга (Панямоння), Усходняга і Заходняга Палесся.

Не ўдаючыся ў падрабязнасці высвятлення лакальна-рэгіянальнай спецыфікі беларускай народнай культуры[25], адзначым, што створаная В.С. Цітовым этнаграфічная класіфікацыя амаль ніяк не карэлявала з сацыяльна рэлевантнымі маркерамі культурных адрозненняў (за выключэннем рэгіёна Палесся, асобная ідэнтычнасць жыхароў якога не выклікала ніякага сумнення нават у савецкія часы[26]). Гістарычны ж падзел беларусаў на «заходнікаў» і «ўсходнікаў», засведчаны, як было паказана, яшчэ ў першых этнатэрытарыяльных класіфікацыях XIX ст. ды ў агульных рысах адлюстраваны ў сучаснай дыялектнай класіфікацыі беларускай мовы, у XX ст. па волі лёсу стаў асацыявацца амаль выключна з траўматычнай для гістарычнай памяці падзеяй – дзяржаўна-палітычным раз'яднаннем беларускай нацыі ў міжваенны перыяд (якое, трэба прызнаць, зрабіла этнакультурную адрознасць заходняй і ўсходняй частак Беларусі яшчэ больш выразнай). Гэта стварала вельмі нюансаваную перспектыву для навуковай канцэптуалізацыі «заходняга» і «ўсходняга» рэгіёнаў Беларусі (у тым ліку, у плане магчымага ўзнікнення непажаданых для палітычнага цэнтру рэгіянальных ідэнтытарных рухаў). Таму вобразнай асновай для новастворанай класіфікацыі стаў сучасны адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел краіны на шэсць абласцей, які, такім чынам, між волі прадвызначыў канструяванне новых этнатэрытарыяльных ідэнтычнасцей[27].

Заўважнае падабенства вылучаных В.С. Цітовым шасці этнаграфічных рэгіёнаў (малюнак 5) з сучаснымі адміністрацыйнымі абласцямі, з аднаго боку, здымала шэраг пытанняў, звязаных з іх фармальнай візуалізацыяй і «лагатыпізацыяй» на культурнай карце Беларусі. З другога боку, прапанаванае «гісторыка-этнаграфічнае раяніраванне матэрыяльнай культуры» практычна ніякім чынам не было звязана з самаразуменнем класіфікаваных такім чынам людзей. Таму зусім нядзіўна, што яно так і не набыло належнай жыццёвай сілы ў іх паўсядзённай сацыяльнай практыцы і не змагло стаць дзейснай інструментальнай асновай для ўзнікнення рэгіянальных ідэнтычнасцей (як гэта адбылося ў суседніх Літве ці Латвіі). Да таго ж, прапанаваныя В.С. Цітовым геаграфічныя найменні[28] для абазначэння шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (апрача назвы Палесся) практычна цалкам выключалі самаідэнтыфікацыю мясцовага насельніцтва ў падобных этнарэгіянальных тэрмінах. Напрыклад, цяжка сабе ўявіць, каб жыхары Віцебскай вобласці калі-небудзь называлі сябе «паазерцамі» ці «падзвінцамі», або ўраджэнцы Гродзенскай вобласці катэгарызавалі сябе як «панямонцы».

---

[24] Цікава, што ніхто з больш асцярожных калег-папярэднікаў В.С. Цітова, якія таксама займаліся арэальнымі даследаваннямі матэрыяльнай культуры беларусаў (Л.А. Малчанава, Э.Р. Сабаленка і інш.), у сваіх вузкаспецыяльных класіфікацыях не наважыўся вылучыць больш за тры фармальныя рэгіёны Беларусі [36, с. 228; 37, с. 38; 38, с. 93].

[25] У гэтым плане паказальную крытыку класіфікацыі В.С. Цітова на прыкладзе Беларускага Падзвіння выканаў У.Я. Аўсейчык [39].

[26] «Метамарфозы» этнарэгіянальнай ідэнтычнасці насельніцтва заходняй часткі Беларускага Палесся падрабязна разгледжаны ў спецыяльным даследаванні П.У. Церашковіча [10].

[27] Пытанне, якім чынам фармальныя этнаграфічныя класіфікацыі здольныя канстытуяваць новую рэчаіснасць і рэіфікаваць этнічнасць, патрабуе асобнага грунтоўнага даследавання.

[28] «Рачная» наменклатура (Падзвінне, Падняпроўе, Панямонне) толькі паказвае, што этнаграфічны рэгіён разглядаецца ў беларускай этналогіі найперш як геаграфічнае паняцце, а не як сацыяльная прастора, якую ўтвараюць і ўвесь час змяняюць людзі.




**Малюнак 5. – Гісторыка-этнаграфічныя рэгіёны Беларусі (паводле В.С. Цітова)**

Тым не менш, гэты безальтэрнатыўны на сённяшні дзень культурна-геаграфічны падзел тэрыторыі Беларусі на *Падзвінне* (або *Паазер'е*), *Панямонне*, *Падняпроўе*, *Цэнтральную Беларусь*, *Заходняе* і *Усходняе Палессе*, за кароткі час стаў дамінантным у афіцыйным навуковым дыскурсе. Дастаткова толькі сказаць, што імкненне беларускіх народазнаўцаў ахапіць класіфікацыйнай сеткай усю традыцыйную культуру Беларусі ў яе сучасных межах вылілася ў выданне шэрагу фундаментальных серый, у якіх рэгіянальная (у тым ліку, духоўная!) культура паслухмяна набывала прасторавыя абрысы афіцыйнай этнаграфічнай класіфікацыі беларусаў.

У выніку фармальнага навуковага падзелу Беларусі і Літвы на асобныя этнаграфічныя рэгіёны, па-за афіцыйнымі практыкамі класіфікацыі засталіся тыя ідэнтычнасці, якія па шэрагу прычын не здолелі ўпісацца ў аналітычныя схемы і канструкты, вынайдзеныя нацыянальнымі школамі этнаграфіі. Такой, да прыкладу, можна лічыць рэгіянальную ідэнтычнасць гістарычнай Віленшчыны, ключавым фактарам канструявання якой ёсць наяўнасць цэнтральнага горада – Вільні, што аказвала і працягвае аказваць вялікі ўплыў на сацыяльныя практыкі жыхароў сумежных тэрыторый Беларусі і Літвы. Яшчэ ў 1920 – 30-х гг. усебаковым вывучэннем і канцэптуалізацыяй Віленскага краю як асобнага этнакультурнага рэгіёна міжваеннай Польшчы займаліся вядомыя выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні (Ц. Бадуэн дэ Куртэнэ-Эрэнкрэйцова, М. Знамероўска-Пруферова, Г. Турска, Ч. Янкоўскі, Ф. Рушчыц, Я. Булгак і інш.), асноўныя ідэі і вынікі даследчай працы якіх былі выкладзены ў манаграфічным зборніку «Вільня і Віленская зямля» («Wilno i ziemia Wileńska») (1930 г.). У першым томе гэтага выдання знакаміты этнолаг Ц. Бадуэн дэ Куртэнэ-Эрэнкрэйцова асцярожна заўважала, што этнічнасць не ёсць галоўнай падставай для функцыянавання рэгіянальнай ідэнтычнасці, тэрытарыяльнае вымярэнне якой хутчэй абумоўлівае важнасць прыроднага і гаспадарча-эканамічнага фактараў: «Па-за межамі этнічнай праблематыкі знаходзяцца таксама некаторыя рысы вясковай культуры ваяводства, якія вынікаюць непасрэдна з яе земляробчага характару, аб'ядноўваючы яе тым самым з культурамі многіх земляробчых народаў нават у тых выпадках, калі не можа ісці гаворкі пра гістарычныя сувязі і кантакты паміж імі. Таксама і ў мінулым мы маем справу з такімі культурнымі ўтварэннямі, якія не варта занадта неабдумана надзяляць уласцівасцямі, характэрнымі толькі для «старажытнай літоўскай культуры», або «беларускай», або нават для культуры ваяводства, бо яны абумоўленыя найперш пэўным гаспадарчым ладам жыцця, які, у сваю чаргу, з'яўляецца вынікам прыстасавання чалавека да прыродных умоў» [40, s. 173].

Аднак пасля ўсталявання ў 1940 г. сучаснай палітычнай мяжы паміж Літвой і Беларуссю гэты гістарычны рэгіён аказаўся падзелены паміж дзвюма дзяржавамі. Хоць ужо ў 1950-х гг. літоўскія этнолагі былі схільныя пашыраць у сваіх даследаваннях тэрыторыю Дзукіі на ўвесь Віленскі край [5, p. 134], да гэтага часу нявырашаным застаецца пытанне, якую ролю ў канцэпцыі этнаграфічных рэгіёнаў павінна адыгрываць іншаэтнічнае («нелітоўскае») насельніцтва ў ваколіцах Вільні. Так, у пачатку XXI ст. літоўскі этнолаг Ж. Шакніс, канстатуючы, што «мабыць адзін з самых бясспрэчных спосабаў лакалізацыі этнаграфічнага рэгіёна ёсць этнаграфічная ідэнтычнасць саміх жыхароў, гэта значыць разуменне таго, да якога этнаграфічнага рэгіёна адносіць сябе сам чалавек» [6, p. 131], даследаваў погляды сучаснай моладзі на этнаграфічныя рэгіёны Літвы. У час палявых экспедыцый ён высветліў, што самая праблематычная сітуацыя з этнарэгіянальнай ідэнтычнасцю выяўляецца як раз на паўднёвым усходзе Літвы, бо абсалютная большасць апытаных ім тут нелітоўцаў не была гатовая атаясамліваць сябе з аніякім этнаграфічным рэгіёнам [6, p. 135–136]. Між тым, такая сітуацыя істотна абцяжарвае хаця б прыблізнае вызначэнне агульнай мяжы Дзукіі і Аўкштайціі, якія ў раёне Вільні фактычна аддзеленыя адна ад адной кампактнай тэрыторыяй з славянамоўным насельніцтвам.

Літоўская даследчыца А. Рагаўскайце, якая ў сваёй манаграфіі абагульніла і прааналізавала ўсе вядомыя этнатэрытарыяльныя класіфікацыі Літвы, у рэшце рэшт так і не знайшла адказу на пытанне, на падставе якіх навуковых крытэраў у другой палове XX ст. Віленшчына раптам стала інтэгральнай часткай Дзукіі [7, p. 95–96]. Больш за тое, на сваёй зводнай карце, дзе асноўны акцэнт робіцца не на дакладных межах асобных рэгіёнаў, а на іх «ядрах», яна не толькі вылучыла Віленшчыну (літ. *Vilnija*) як самастойны этнакультурны рэгіён Літвы, але яшчэ і абазначыла славянамоўную яе частку (малюнак 6).




**Малюнак 6. – Тэрытарыяльная структура фармальных рэгіёнаў Літвы (паводле А. Рагаўскайце)**

Выпадак Віленшчыны выяўляе ўмоўнасць і адноснасць не толькі навукова сканструяваных этнаграфічных рэгіёнаў Літвы, але і Беларусі. Так, у пачатку XXI ст. усё той жа В.С. Цітоў у энцыклапедычным даведніку, выдадзеным пад яго рэдакцыяй, недвухсэнсоўна сцвярджаў: «Віленшчына – гісторыка-этнаграфічны рэгіён на сумежжы рассялення славян і балтаў. Вільня і Віленскі край, дзе перакрыжоўваліся гістарычныя лёсы і ўзаемастасункі суседняга беларускага, летувіскага і польскага народаў, былі і застануцца [sic] неад'емнай часткай нашай айчыннай гісторыі і культуры» [41, с. 79]. Так ці інакш, сучасныя рэгіёны Беларусі і Літвы ў наш час імкліва змяняюцца як складовая частка больш шырокай глабальнай прасторы, таму этнаграфічны рэгіён усё больш успрымаецца выключна як сімвалічная канструкцыя, якая, аднак, мае важнае значэнне ў выхаванні пачуццяў агульнай прыналежнасці і адметнасці.

**Заключэнне.** Такім чынам, самыя першыя спробы класіфікаваць беларусаў і літоўцаў паводле іх этнатэрытарыяльных асаблівасцей былі зроблены яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Гэтыя класіфікацыі ў значнай ступені былі заснаваныя на рэгіянальных самапрэзентацыях мясцовага насельніцтва і адлюстроўвалі гістарычны падзел літоўцаў як мінімум на дзве вялікія групы – аўкштайтаў і жэмайтаў, а беларусаў – на ўсходніх і заходніх, а таксама палешукоў і падляшан. На працягу XX ст. навуковыя практыкі этнаграфічнай класіфікацыі літоўцаў пастаянна ўдасканальваліся і карэктаваліся з улікам гістарычных змен і дзяржаўна-тэрытарыяльных трансфармацый. Пры гэтым у іх канцэптуальнай аснове ляжалі не толькі так званыя «аб'ектыўныя» крытэрыі рэгіянальнай прыналежнасці (асаблівасці мовы, культуры, паходжання і інш.), але і так званыя «суб'ектыўныя» якасці (пачуццё прыналежнасці, калектыўная памяць, этнічныя стэрэатыпы і інш.), г. зн. рэпрэзентацыі, праз якія класіфікаваныя такім чынам людзі самі ўяўляюць гэты падзел і якія, у рэшце рэшт, садзейнічаюць рэчаіснасці такога падзелу. У пачатку XXI ст. у Літве адбылося канчатковае зацвярджэнне пяці асноўных этнаграфічных рэгіёнаў – Аўкштайціі, Жэмайціі, Дзукіі, Сувалкіі і Малой Літвы, якія атрымалі шырокае прызнанне і легітымнасць.

Навуковае ж канструяванне этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, распачатае толькі ў апошняй чвэрці XX ст., адбывалася пераважна на падставе знешніх «аб'ектыўных» адрозненняў і амаль ніяк не было звязана з самаразуменнем класіфікаваных такім чынам людзей, што абумовіла іх ідэнтытарную нежыццяздольнасць у паўсядзённай сацыяльнай практыцы.

## ЛІТАРАТУРА


1. Титов, В.С. Историко-этнографические регионы в экспозиции Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта / В.С. Титов. – Минск : Полымя, 1982. – 72 с.
2. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов: XIX – начало XX в. / В.С. Титов. – Минск : Наука и техника, 1983. – 152 с.
3. Цітоў, В.С. Народная спадчына: Матэрыяльная культура ў лакальна-тыпалагічнай разнастайнасці / В.С. Цітоў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1994. – 300 с.
4. Savoniakaitė, V. Įvadas. Tapatybė erdvėje ir laike: kintatntys regionai / V. Savoniakaitė // Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos. – 2007. – № 7(16). – P. 19–37.
5. Tumėnas, V. Konvencionalūs, klasifikaciniai ir interpretaciniai regioninės tapatybės aspektai ir sąsajos su tautodaile / V. Tumėnas // Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos. – 2007. – № 7(16). – P. 125–156.
6. Šaknys, Ž. Etnografiniai regionai Lietuvoje: šiuolaikinio jaunimo požiūris / Ž. Šaknis // Tautosakos darbai. – 2012. – XLIII. – P. 126–142.
7. Ragauskaitė, A. Lietuvos etnokultūrinis regionavimas / A. Ragauskaitė. – Vilnius : Vilniaus universiteto leidykla, 2019. – 192 p.
8. Бурдье, П. Идентичность и репрезентация: элементы критической рефлексии идеи «региона» / П. Бурдье // Ab Imperio. – 2002. – № 3. – С. 45–60.
9. Hobsbawm, E. Introduction: Inventing Traditions / E. Hobsbawm // The Invention of Tradition. Edited by E. Hobsbawm and T. Ranger. – Twelfth printing. – Cambridge University Press, 2004. – P. 1–14.
10. Терешкович, П.В. Конструирование идентичностей населения западной части Белорусского Полесья / П.В. Терешкович // Свои и чужие. Метаморфозы идентичности на востоке и западе Европы / В.В. Амелин [и др.] ; под ред. Е.И. Филипповой и К. Ле Торривеллека. – М., 2018. – С. 247–270.
11. Narbutt, T. Oznaczenie granic Litwy właściwej od strony Słowiańszczyzny / T. Narbutt // Pomniejsze pisma historyczne: szczególnie do historii Litwy odnoszące się. – Wilno, 1856. – S. 268–270.
12. Baliński, M. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym / M. Baliński, T. Lipiński. – Warszawa, 1846. – T. 3. – 866 s.
13. Talko-Hryncewicz, J. Charakterystyka fizyczna ludów Litwy i Rusi / J. Talko-Hryncewicz. – Kraków, 1893. – 122 s.
14. Эркерт, Р.Ф. Взгляд на историю и этнографию западных губерний России (с атласом) / Р.Ф. Эркерт. – СПб. : В тип. Дома Призрения Малолетних Бедных, 1864. – 72 с.
15. Эркерт, Р.Ф. Этнографический Атлас западнорусских губерний и соседних областей / Р.Ф. Эркерт. – СПб., 1863. – 28 с.
16. Белорус. Библиографическая заметка по поводу III тома Живописной России (Литва и Белоруссия – соч. Киркора) / Белорус // Литовские епархиальные ведомости. – Март 1884. – № 9. – С. 83–91.
17. Белы, А. Хроніка Белай Русі: Імагалогія Беларусі XII – XVIII стст. / А. Белы. – 2-е выд., папраўл. і дапоўн. – Смаленск, 2013. – 468 с.
18. Долбилов, М.Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М.Д. Долбилов. – М. : Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.
19. Czeczot, J. Piosnki wieśniacze z nad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy, w mowie Sławiano-Krewickiej, s postrzeżeniami nad nią uczynionemi / J. Czeczot. – Wilno : Drukiem Józefa Zawadzkiego, 1846. – 134 s.
20. Połujański, A. Wędrówki po gubernji augustowskiéj w celu naukowym odbyte / A. Połujański. – Warszawa, 1859. – 450 s.
21. Вольтер, Э. Об этнографической поездке по Литве и Жмуди летом 1887 года / Э. Вольтер // Приложение к XVI тому Записок Императорской Академии Наук. – СПб., 1887. – № 5. – С. 1–158.
22. Dzukas. Isz Dzukijos / Dzukas // Varpas. – 1889. – Nr. 10. – P. 157.
23. Kalnius, P. Etnografinė Dzūkija / P. Kalnius // Lietuvos etnologijos ir anropologijos enciklopedija / Lietuvos istorijos institutas ; sudarė V. Savoniakaitė. – Vilnius, 2011. – P. 98–104.
24. Сербов, И.А. Белоруссы-сакуны. Краткий этнографический очерк / И.А. Сербов. – Петроград : Тип. Императорской Академии Наук, 1915. – 180 с.

25. Локотко, А.И. Историко-культурные ландшафты Беларуси / А.И. Локотко. – Минск : Белорус. наука, 2006. – 470 с.
26. Kalnius, P. „Kitokie“ tarp „savų“: Lietuvos etnografinių grupių stereotipai / P. Kalnius // Lietuvos etnologija: socialinės antropologijos ir etnologijos studijos. – 2002. – Nr. 2(11). – P. 23–52.
27. Kalnius, P. Etnografinė Suvalkija / P. Kalnius // Lietuvos etnologijos ir anropologijos enciklopedija / Lietuvos istorijos institutas ; sudarė V. Savoniakaitė. – Vilnius, 2011. – P. 109–116.
28. Меркене, Р. О влиянии административно-территориального деления на специфику этнографических областей Литвы / Р. Меркене // Проблемы этнической истории балтов : тезисы докладов межресп. науч. конф. / АН Латвийской ССР, Ин-т истории ; редкол.: И.Э. Ронис (отв. ред.) [и др.]. – Рига, 1985. – С. 135–138.
29. Унуковіч, Ю. Малая Літва / Ю. Унуковіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. – Мінск, 2005–2006. – Т. 2. – 2006. – С. 264–265.
30. Matulevičius, A. Mažosios Lietuvos lietuvininkai (Prūsijos lietuviai, mažlietuviai) / A. Matulevičius // Lietuvos etnologijos ir anropologijos enciklopedija / Lietuvos istorijos institutas ; sudarė V. Savoniakaitė. – Vilnius, 2011. – P. 293–297.
31. Blockytė, K. Mažosios Lietuvos lietuvininkų tautinis tapatumas: istorija ir vieta / K. Blockytė // Tradicija ir dabartis. – Vol 7 (2012). – P. 113–127.
32. Цимерманис, С.Я. Об историко-этнографических областях в Латвии и Литве во второй половине XIX в. / С.Я. Цимерманис, В.И. Моркунас // Этнографические и лингвистические аспекты этнической истории балтских народов / АН Латвийской ССР, Ин-т истории ; редкол.: М. Рудзите, М. Слава, С. Цимерманис (отв. ред.). – Рига, 1980. – С. 9–45.
33. Историко-этнографический атлас Прибалтики / Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая АН СССР ; редкол.: Л. Терентьева (гл. ред.) [и др.]. – Вильнюс : Мокслас, 1985. – Т.1. Земледелие / Под ред.: М. Рабинович (отв. ред.) [и др.]. – 140 с.
34. Историко-этнографический атлас Прибалтики / Редкол.: Л.Н. Терентьева (гл.ред.) [и др.] ; Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая АН СССР. – Рига : Зинатне, 1986. – Одежда / М.К. Слава [и др.] ; под ред. Г.С. Масловой (отв. ред.) [и др.] ; Ин-т этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая АН СССР, Ин-т истории АН ЛатвССР, Ин-т истории АН ЛитССР, Ин-т истории АН ЭССР, Гос. этнограф. музей ЭССР. – 173 с.
35. Титов, В.С. Историко-этнографическое районирование материальной культуры белорусов (XIX – начало XX в.) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.07 / В.С. Титов ; АН СССР, Ин-т этнологии и антропологии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. – М., 1991. – 38 с.
36. Молчанова, Л.А. Материальная культура белорусов / Л.А. Молчанова. – Минск : «Наука и техника», 1968. – 230 с.
37. Малчанава, Л.А. Асноўныя лакальныя асаблівасці жаночага адзення / Л.А. Малчанава // Беларускае народнае адзенне. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – С. 38–44.
38. Сабаленка, Э.Р. Лакальныя асаблівасці і тыпы беларускага народнага жылля / Э.Р. Сабаленка // Беларускае народнае жыллё / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск, 1973. – С. 93–98.
39. Овсейчик, В.Е. К вопросу об этнокультурном районировании Белорусского Подвинья / В.Е. Овсейчик // Псковский регионологический журнал. – 2019. – № 2 (38). – С. 36–50.
40. Baudouin de Courtenay-Ehrenkreutzowa, C. Kilka uwag i wiadomości o etnografji Województwa Wileńskiego / C. Baudouin de Courtenay-Ehrenkreutzowa // Wilno i ziemia Wileńska. – Wilno, 1930. – T. 1. – S. 173–218.
41. Цітоў, В.С. Віленшчына / В.С. Цітоў // Народная культура Беларусі. Энцыкл. давед. / пад агул. рэд. В.С. Цітова. – Мінск : БелЭн, 2002. – С. 79–80.

*Паступіў 26.11.2020*

## THE INVENTION OF ETHNOGRAPHIC REGIONS OF BELARUS AND LITHUANIA: COMPARATIVE CHARACTERISTICS

***Yu. VNUKOVICH***

*The invention of ethnographic regions of Belarus and Lithuania as tools of scientific classification and interpretation of territorial variants of ethnic culture is compared. The exceptional importance of socially relevant markers of territorial identity / difference for the successful construction of an ethnographic region in both scientific and broad public discourse is shown. The example of the historical Vilnius region demonstrates how ethnically heterogeneous border areas are integrated into national projects of ethnographic regions as a result of state and territorial changes.*

***Keywords:*** *ethnic culture, scientific classification, ethnographic region, categorization, identification, Belarus, Lithuania, comparative studies.*